З тых часоў усё зьмянілася. Дзякуючы адзінству югаслаўская апазыцыя перамагла на прэзыдэнцкіх, а потым і на парляманцкіх выбарах, а кааліцыя буйнейшых беларускіх палітычных партыяў, грамадзкіх арганізацыяў, аб'яднаных у Каардынацыйную раду дэмсілаў, перажывае пэўныя цяжкасьці. Наколькі яскрава супярэчнасьці паміж living рознымі палітычнымі сіламі Беларусі праявіліся падчас сустрэчы з эўратройкай (прадстаўнікамі Эўрапарляманта, Парляманцкіх асамблеяў Рады Эўропы ды АБСЭ), і як гэта можа паўплываць на далейшыя пэрспэктывы КРДС, тлумачаць самі палітыкі ды экспэрты.

**ВІНЦУК ВЯЧОРКА (БНФ):** У кіраўніцтва БНФ, АГП, БСДП»НГ» і БСДГ была асобная сустрэча з эўратройкай. Хачу сказаць, што паміж спадарамі Лябедзькам, Алампіевым і мной ніякіх супярэчнасьцяў наконт таго, на што мы спадзяемся ад візыту эўратройкі, не было. А спадзяемся мы й на выкананьне трох умоваў правядзеньня дэмакратычных выбараў, і на адназначную й пасьлядоўную ацэнку Палаты прадстаўнікоў як нелегітымнай структуры й, адпаведна, выбараў у яе як фарсу.

Нагадаю, што па апошнім пункце існуе салідарная пазыцыя абсалютнай бальшыні суб'ектаў КРДС, і гэтая пазыцыя была зафіксавана ня толькі на самой каардынацыйнай радзе, а на Кангрэсе дэмакратычных сілаў. На вялікі жаль, спадар Нісьцюк на ўзгаданай мною сустрэчы пачаў пераконваць эўрапейцаў, што ў беларускім дэмакратычным асяродзьдзі няма адзінства ня толькі па гэтым, але й па іншых пытаньнях, хаця ўсе ведаюць, што толькі частка БСДП займае апартуністычную пазыцыю ў дачыненьні да Палаты прадстаўнікоў. І, натуральна, гэтая пазыцыя спадара Нісьцюка – выплёскваньня бруднай вады – на жаль, магла пераканаць эўрапейцаў у тым, што ў Беларусі быццам бы не існуе дэмакратычнай кааліцыі, хаця кааліцыя такая ёсьць.

Я думаю, насамрэч усе супярэчнасьці выкліканы дзьвюма прычынамі: сымпатыямі да таго ці іншага прэтэндэнта на ролю адзінага кандыдата й комплексамі непаўнавартасьці некаторых партыяў. Калі КРДС пасьлядоўна трымаецца пэўнай працэдуры вызначэньня кандыдата, якога падтрымае кааліцыя, то праблема пэрсанальных сымпатыяў да таго ці іншага кандыдата проста зьнікае. Любая ж атака на адзінства дэмакратычных сілаў выгодная рэжыму.

**УЛАДЗІМІР НІСЬЦЮК (БСДП):** Па-першае, трэба падкрэсьліць, што не паміж чатырма палітычнымі партыямі, а паміж усімі палітычнымі сіламі нашае краіны існуе два падыходы ў бачаньні пэрспэктываў барацьбы на прэзыдэнцкіх выбарах.

Першы падыход заключаецца ў тым, што адзіным цэнтрам, які здольны аб'яднаць усе дэмакратычныя сілы грамадзтва, сфармаваць каманду, якая павядзе да перамогі на прэзыдэнцкіх выбарах, ёсьць Каардынацыйная рада дэмсілаў. КРДС у асноўным прадстаўляе інтарэсы палітычных партыяў. І фактычна рада ўжо раскалолася. Усе ведаюць пра ліст лідэра БСДГ Станіслава Шушкевіча, у якім заяўлена, што Грамада перапыняе свой удзел у працы КРДС, пакуль там не адновяць сваю працу прадстаўнікі ўсіх шасьці партыяў-заснавальніц рады, і галоўным чынам БСДП. Зараз жа ў радзе з шасьці заснавальніц прадстаўлены дзьве партыі – БНФ і АГП.

Другі падыход заключаецца ў тым, што партыі ня здольны аб'яднаць усе апазыцыйныя сілы грамадзтва, мабілізаваць усіх перад прэзыдэнцкімі выбарамі. Трэба ствараць больш шырокую кааліцыю. Падчас сустрэчы з эўратройкай гэтыя разыходжаньні ў бачаньні праблемы выявіліся яскрава. Зразумела, што АГП і БНФ адстойвалі першы падыход, я – другі. Віктар Алампіеў, прадстаўнік БСДГ, сталы палітык зь вялікім досьведам, ня стаў акрэсьліваць пазыцыю сваёй партыі, а зьвярнуў увагу замежнай дэлегацыі на расейскі фактар.

Я мяркую, што разлад унесены звонку намаганьнямі ўлады й некаторымі замежнымі партнэрамі, якія не разабраліся ў нашай сытуацыі, але спрабуюць навязаць сваё бачаньне тактыкі дзеяньняў на прэзыдэнцкіх выбарах. Але зараз назіраецца некаторае аздараўленьне, сама сытуацыя штурхае да адзінства. Трэба стварыць незалежны каардынацыйны цэнтар, які аб'ядлнае намаганьні ўсіх апазыцыйных сілаў. КРДС з гэтай роляй ня справілася. Няма сумненьня, што такі цэнтар зьявіцца, розум прывядзе нас да адзінага цэнтра й адзінага кандыдата.

**АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА (АГП):** Перад сустрэчай з эўратройкай рознымі партыямі ставіліся розныя мэты. Напярэдадні я папрасіў прадстаўнікоў партыяў сустрэцца, каб выпрацаваць агульныя падыходы. Прыйшлі ўсе, але падчас самой сустрэчы ўсё ж такі вялі сябе парознаму. Калі прадстаўнікі трох партыяў – АГП, БНФ і сацыял-дэмакраты Шушкевіча – далі палітычнай сытуацыі ў Беларусі аднолькавую ацэнку, то спадар Нісьцюк паводзіў сябе ад адваротнага. Калі ўсе казалі: *«гэта чорнае»*, ён казаў: *«не, гэта зялёнае»*. Я ня ведаю, якая была матывацыя такіх паводзінаў, але было жаданьне паказаць, што ў сацыял-дэмакратаў Статкевіча ёсьць асобае меркаваньне.

Адзінае ж адорозьненьне паміж намі ў тым, што частка БСДП прымае актыўны ўдзел у выбарах у так званую Палату прадстаўнікоў. Гэта прыводзіць і да розьніцы ў ацэнцы палітычнай сытуацыі. Я зьвярнуся да КРДС, каб мы прынялі адмысловы зварот да сацыял-дэмакратаў: яны самі павінны прапанаваць свайму лідару Статкевічу зьняць сваю кандыдатуру на апошнім этапе выбарчае кампаніі. Дагэтуль мы ад яго чулі, што сама палата нелегітымная, яна ня ёсьць законным парлямантам, але для яго самае галоўнае – удзел у кампаніі, мажлівасьць працаваць з выбаршчыкамі. Цудоўна: вы скарысталі гэтыя мажлівасьці для прапаганды дэмакратычных ідэяў, а зараз, на апошнім этапе, дзеля адзінства пазыцый напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў здыміце сваю кандыдатуру. Гэта было б правільна як з палітычнага, так і з маральнага пункту гледжаньня.

Што ж тычыцца астатніх партыяў-суб'ектаў КРДС, то ёсьць пэўныя адрозьненьні, тактычныя, з Партыяй працы Бухвостава, але ў бліжэйшы час (думаю, пасьля давыбараў у Палату прадстаўнікоў) яны будуць зьняты. А з жаночай партыяй *«Надзея»* увогуле поўнае паразуменьне, ніякіх супярэчнасьцяў няма.

**ВІКТАР АЛАМПІЕЎ (БСДГ):** Маё асабістае адчуваньне, што ўнутраныя супярэчнасьці, якія ёсьць у КРДС, падчас сустрэчы з эўратройкай не праявіліся. Праўда, з боку спадара Нісьцюка прагучала думка, што кожная партыя мае права ўдзельнічаць ці ня браць удзел у выбарах. Гэта была спроба абароны пазыцыі БСДП, удзелу некаторых сацыял-дэмакратаў у палатных выбарах.

Унутры ж КРДС сапраўды існуе пэўная напружанасьць: працяглы час у працы рады дэмсілаў ня ўдзельнічаюць прадстаўнікі БСДП, Партыі працы. Мы паспрабавалі сабраць усіх заснавальнікаў КРДС. Зрэшты, альбо гэты ворган бярэ на сябе адказнасьць па вылучэньні адзінага кандыдата, альбо трэба рабіць нешта іншае. Ёсьць верагоднасьць, што ня ўсё можа атрымацца, і справа нават ня ў тым, што існуюць супярэчнасьці паміж партыямі.

Трэба ўлічваць і тую акалічнасьць, што зараз ня ўсе кандыдаты хацелі б выступаць пад сьцягам аб'яднанае апазыцыі, ад імя дэмакратычных сілаў. Усе прэтэндуюць заняць нішу так званага незалежнага кандыдата. Гэта адбываецца пад уплывам дадзеных сацапытаньняў, якія фіксуюць, што за нейкага невядомага незалежнага кандыдата гатовыя галасаваць ледзь не 50 адсоткаў выбаршчыкаў. Сытуацыя ўнікальная, бо ніводзін кандыдат ня можа быць незалежны, за ім заўсёды хтосьці стаіць. Незалежны – некарэктная фармулёўка.

Другая важная акалічнасьць – гэта тое, што на прэзыдэнцтва прэтэндуюць людзі з розным практычным і палітычным досьведам. І галоўная праблема палягае ў тым, што іх ня здолелі прымусіць знайсьці нейкае паразуменьне паміж сабой, прыйсці да пагадненьня, дзе абумоўліваецца, у якіх варунках яны пагаджаюцца выступіць адной камандай, акумуляваць усе свае рэсурсы дзеля перамогі аднаго зь іх. Вось гэта й не атрымалася. А калі б намеціўся нейкі лідэр сярод іх, то дэмакратычныя сілы таксама дамовіліся б. ■

МНЕНИЕ ЭКСПЕРТОВ

**СЕРГЕЙ АЛЬФЕР (Белорусский центр конституционализма и сравнительно-правовых исследований):** С моей точки зрения, расхождения, конечно же, есть. Правда, я бы не назвал это расхождениями внутри оппозиционных сил, а только среди оппозиционных лидеров. Однако они не носят на сегодняшний день драматического характера, это тактические расхождения, и в последствии они будут преодолены. Наиболее сложным вопросом являются только отношения между основной политической элитой и лидером БСДП Николаем Статкевичем в связи с тем, что он не хочет участвовать в совместной политической игре, и его поведение зачастую противоречит установленным правилам поведения других партийных лидеров. В конечном итоге все закончится общим участием в политической борьбе, совместной работой в рамках КРДС или более широкой коалиции в президентских выборах.

Несмотря на наличие определенных трений, у всех субъектов рады демсил все-таки превалирует стремление сохранить единство. Поэтому говорить о развале координационной рады не приходится. Кроме того, КРДС не та структура, которая мыслит только одними рамками. Она способна менять свою точку зрения. Свидетельством тому является то, что принято решение о наличии на сегодняшний день двух оппозиционных политических центров, которые конкурируют между собой. В рамках конкуренции далее будет определяться, кто же станет более реальным кандидатом в президенты, которого демократические силы в результате назовут единым. Надеюсь, что именно по такому сценарию и пойдет работа, и в ближайший месяц мы узнаем фамилию единого кандидата в президенты, тем более, что этого требует народ.

**ВИКТОР ЧЕРНОВ (заведующий секцией политологии БАТУ):** В КРДС существуют разногласия по целому ряду вопросов. Во-первых, это проблема выдвижения единого кандидата. Во-вторых, неучастие в работе рады БСДП. Также Белорусская партия труда бойкотирует заседания КРДС. И третья проблема – постоянно ставятся под вопрос представительство в раде *«Хартии'97»* и полномочия Андрея Санникова.

Но на самом деле все эти проблемы вертятся вокруг основной – проблемы единого кандидата. Фронт, ОГП, «Хартия» уже определились с выдвижением и поддержкой Семена Домаша. А женская партия *«Надзея»*, Партия труда Бухвостова, БСДГ Шушкевича поддерживают кандидатуру Владимира Гончарика. В этой достаточно напряженной ситуации ОГП инициировала, на мой взгляд, правильное решение: идти на регистрацию двумя центрами. Правоцентристский – это Домаш, и левоцентристский – это Гончарик, а возможно, в его команде будут еще Чигирь и Козловский. Такой подход к решению проблемы, я думаю, на сегодняшний момент снимает напряженность и дает возможность КРДС действовать по единому сценарию.

Конечно, было бы идеально, если по итогам раскрутки кандидатов, по результатам социсследований либо иных процедур, которые имеются, можно было бы эти центры объединить в пользу бесспорного фаворита еще до регистрации.

Перспектива объединения зависит только от доброй воли, от возможности ставить интересы общего дела выше своих личных амбиций, субъективных пристрастий. У меня есть данные, что ОГП после того, как на уровне Политсовета поддержала Домаша, начинает присматриваться к кандидатуре Гончарика. Он в последнее время достаточно активно себя продвигает, в то время, как Домаш, по мнению некоторых наблюдателей, немного сбавил обороты. И если Гончарик будет активно набирать политический капитал в ближайший месяц, то, возможно, ОГП переориентирует свою поддержку на него. Тогда вопрос будет стоять только о позиции БНФ. Не исключено, что и БНФ склонится к этому решению. Но это должно быть очень взвешенное решение, основанное на конкретных шансах кандидата.

ПАЛІТЫЧНЫ ПАРТРЭТ

# ШКЛОЎСКІЯ СТРАСЦІ

ВОЛЬГА ПАЎЛАВА

*Працяг. Пачатак у №№ 7-10*

**«... ТАМ ВЫРАС ХРЭН»**

– Вы за каго, Вольга, будзеце галасаваць? – спыталася ў мяне напярэдадні выбараў загадчыца адзела пісьмаў С. М. Жукоўская.

– За Лукашэнку, – адказваю. – І іншых агітую. Толькі ён, Лукашэнка, найбольш адпавядае дэпутацкаму званню.

– Што вы, што вы? – замахала яна рукамі, быццам адбіваючыся ад нячысціка. – Вы ж прыезджая, таму яго зусім не ведаеце. А шклоўцы ведаюць, таму, я ўпэўнена, і прагаласуюць за цудоўнага чалавека, урача ад Бога – Вітольда Палікарпавіча Буевіча.

... Абодва яны неўзабаве прайшлі ў другі тур. І ў нялёгкай барацьбе перамог маладзейшы – Лукашэнка. Перамогу тую дружна, з размахам адсвяткавалі ў доме Уладзіміра Канаплёва.

Аляксандр Рыгоравіч сінхронна з дэпутацтвам набіраў і вагу, аўтарэтэт на Шклоўшчыне. Тыя, хто не зважаў на яго раней або ў спрэчках лудзіў горла, палічылі за лепшае забыць мінулую неразважлівасць і блізарукасць, спяшаліся прадэманстраваць у мэтах бяспекі калі ўжо не сімпатыю і прыхільнасць да яго, дык хоць нейтралітэт. Такім чынам, колькасць яўных апанентаў рэка зменшылася, і Лукашэнка адчуваў сябе на Шклоўшчыне прывольна.

Пасля абрання дэпутатам Вярхоўнага савета БССР ён пачаў змагацца за ўсеагульную папулярнасць. Яго голас з пленарных паседжанняў Вярхоўнага савета трансліраваўся на радыёстанцыі і далятаў у кожны шклоўскі дом. Шклоўшчына дзівілася шырыні кругагляду і эрудыцыі звычайнага, як здавалася раней, дырэктара саўгаса. І калі яму ў чарговы раз давалі слова ля знаёмага ўсім шостага мікрафона, радыёпрыёмнікі ўключаліся на ўсю гучнасць. Асабліва ў гэтым плане вызначаўся Дом саветаў: на яго чатырохпавярховым калідоры выплюхвалася стогалосая лукашэнкаўская мова ў радыёінтэпрэтацыі. Стварася ўражанне, што прамоўца знаходзіцца адначасова ў кожным кабінеце і з уласцівай яму эмацыянальнасцю пераконвае працуючых і наведвальнікаў менавіта ў сваім пункце гледжання. Адным словам, слухалі ўсе, а потым дзяліліся сваімі ўражаннямі.

Аднойчы я пачала заўважаць, як над А. П. Гардзеевым, які ўзначальваў землеўпарадкавальную службу ў раёне, многія пачалі падсмейвацца, выкарыстоўваючы пры гэтым у самых розных варыяцыях словы «хрэн», «сумленне». Кабінет Гардзеева знаходзіўся на трэцім паверсе, і мы, хочаш не хочаш, а ў такім домсаветаўскім суседстве і па сто разоў на дні сутракаліся. І калі гэтае непрыстойнае словазлучэнне нацёрла мой слых, я не вытрымала і спыталася ў нашага фотакора Аляксандра Бяласава, якім такім хрэнам даймаюць Гардзеева? Наш агульны кабінет рэдакцыі рэдка калі пуставаў. На той момант там гартаў падшыўкі старшыня гарсавета Аляксандр Чупрынскі, і былі яшчэ чалавекі чатыры супрацоўнікаў.

– Што, ты не чула пра хрэн? – раскаціста рассмяяўся той. – Вось дык памочніца ў Лукашэнкі – нічога не ведае пра выказванне свайго патрона.

Пры гэтым Бялясаў накіраваў у мой бок свой здаравенны кулак з выцягнутым бы пад лінеечку пальцам.

– Чуеш, Саша, яна, ха-ха-ха, нічога не ведае пра хрэн.

І кабінет узарваўся выбуховым рогатам. З акулярамі на кончыку носа прымчаўся рэдактар Л. М. Анціпенка і, унікнуўшы ў сэнс, не стрымаўся, уліўся ў рогатавы хор.

«Ненармальныя!» – характарызавала іх я, назіраючы за пастацямі, што згіналіся ад прыступу смеху, за разяўленым ледзь не на ўвесь твар ратамі і шчылінамі замест вачэй, з якіх цяклі слёзы. Трывожна азіраючыся, я з нарастаючай хуткасцю перасекла памяшканне і, дасягнуўшы дзвярэй, ледзь не выфутболіла сябе, зачыняючы іх за сабой. Доўга яшчэ потым блукала па калідорах, не рызыкуючы вярнуцца. А калі нарэшце адважылася, насельнікі, саромячыся надаўняй зубаскальні, запыталіся:

– Што, сапраўды нічога не ведаеш пра той хрэн?

Я адмоўна пахістала галавой. І мне расказалі...

На адным з пасяджэнняў Вярхоўнага Савета было прынята рашэнне аб тым, што блізкія да ўлады людзі больш не маюць права адначасова займаць свае пасады і валодаць зямлёй, якую на той час многія займелі. У Шклове па 50 і больш гектараў высокаўраджайнай зямлі паспелі замацаваць за сабой старшыня райвыканкама А. Г. Думлер, старшыня калгаса імя Леніна У. І. Маліноўскі, начальнік экалагічнай службы С. А. Панкратаў, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання А. М. Фірага і дырэктар саўгаса «Гарадзец» А. Р. Лукашэнка. Участак Лукашэнкі знаходзіўся кіламетры за тры ад Рыжкавічаў па мінскаму маршруту. Яшчэ раней я чула па радыё яго выказванні па зямельнаму пытанню:

– Асабіста мне зямля не патрэбна. А мае сыны Віця і Дзіма – просяць захаваць надзел. Кажуць: «Мы, тата, самі яго апрацоўваць будзем». І я не магу ім адмовіць, няхай працуюць, грошы зарабляюць.

А потым, калі пад зямельныя патанні была падведзена заканатворчая база і трэба было выбіраць пасаду ці зямельны надзел, хтосьці з дэпутатаў праехаўся па Лукашэнку, абвінаваціўшы яго ў невыкананні прынятых Вярхоўным Саветам законаў. А ён і паправіў: маўляў, спазніўся, браце, ад зямлі я даўно ўжо адмовіўся.

Гэтую лаянку, на сваё няшчасце, слухаў па радыё Гардзееў, раённы землеўпарадкавальнік. Педантычны Аляксандр Пятровіч быў шакіраваны: каму верыць – сваім вушам ці раней бесправальнай памяці? Крыху паразважаўшы, засумняваўся ў апошнім, бо такі вялікі чалавек ды так чыстасардэчна хлусіць не будзе. Таму кумельгам паімчаўся ўдакладніць усё ў дзелавых паперах, падняў стосы стэнаграмаў райвыканкамаўскіх пасяджэнняў. Нават спацеў, а заявы Лукашэнкі пра адмову ад зямлі так і не знайшоў, не кажучы ўжо пра рашэнне. Доўга вагаўся, але потым перамагла службітасць і ён, адшукаўшы Аляксандра Рыгоравіча ў Мінску, далікатна папрасіў усё ж аформіць пісьмова сваю адмову, маўляў, слова да справы не падшыеш. На што Лукашэнка заявіў:

– Ведаеш, Саша, а я не збіраюся ад яе адмаўляцца, хоць, прызнаюся, займаюся больш важнымі, дзяржаўнымі справамі. Анак мае сыны растуць, ужо і самастойна могуць зямлю апрацоўваць, грошы мазалём зарабляць. Таму без згоды сыноў на гэта ніякай адмовы ад мяне не будзе.

Аляксандр Пятровіч збянтэжыўся:

– А як жа вас разумець, Аляксандр Рыгоравіч, у мікрафон на ўсю рэспубліку вы кажаце адно, а мне – зусім іншае. Дзе ж ваша сумленне?

Лукашэнка ад смеху ледзь трубку ўтрымаў у руцэ:

– Дзе, Саша, было сумленне, там вырас хрэн.

... Крыху паздаваўшы свой зямельны ўчастак у арэнду, А. Р. Лукашэнка ўсё ж афіцыйна адмовіўся ад яго. Не ведаю толькі, якой датай аформлена была ягоная заява: «дахрэнава» ці пазнейшай.

***Працяг у наступным нумары***

КРЫМІНАЛ

# Пільнасьць не губляюць

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

**Нягледзячы на імклівую рэарганізацыю, у Беларусі застаецца больш як сотня тысяч падначаленых міністэрству ўнутраных спраў. За пракуратурай афіцыйна замацавана ня больш як дзьве тысячы прафэсыяналаў. У выніку колькаснага пераразьмеркаваньня народу, які называе сябе абаронцамі грамадзкага спакою, чакаецца некаторае паляпшэньне балянсу, але спадзяваньні ня мусяць быць дужа вясёлкавымі.**

Да апошняга часу пракуратурныя сьледчыя загіналіся пад навалай сваіх адвечных абавязкаў. Яны займаліся рознага кшталту наглядамі за бясьпекай на вытворчасьці, за падлеткавай злачыннасьцю, кантралявалі працу міліцыянтаў. Беларускія заканадаўцы прыдумалі павесіць на іх дадатковы клопат. Цяпер пракуратурныя адмыслоўцы мусяць абавязкова прысутнічаць на судах па ўсіх ініцыяваных імі разьбіральніцтвах і падтрымліваць пракурорскія абвінавачваньні.

Ведаючы, якімі доўгімі бываюць судовыя паседжаньні, можна толькі паспачуваць сьледчым. Іх працоўны дзень значна павялічваецца, бо іх непасрэдных абавязкаў ніхто не скасоўвае. Каб пракурорскія працаўнікі зусім ня выдахліся, ім у дапамогу вылучылі малайцоў – колішніх супрацоўнікаў МУС. За справу ў менскіх раённых пракуратурах узяліся 30 перакваліфікаваных МУСаўцаў (па 3–4 чалавекі ў кожным з адзьдзелаў). Рэальная запатрабаванасьць кваліфікаваных супрацоўнікаў ацэньваецца самімі сьледчымі ў межах 2–2,5 тысяч чалавек.

Крыўда бярэ сьледчых, якія, адзаймаўшыся па пяць год ва ўнівэрсытэтах, змушаныя начэй недасыпаць на сваёй нярвовай працы, чакаючы спаўненьня лукашэнкавай абяцанкі аб стодаляравых заробках. Дзяржава ня дужа клапоціцца аб сьледчыцкім дабрабыце. Прэміямі іх песьцяць не часьцей як раз у квартал. За асаблівую стараннасьць накідваюць тысячы па 3–4.

Адзін з такіх ударнікаў неяк паскардзіўся, што дадатак да заробку былога ягонага аднаклясьніка сягае да 120-х тысяч. Колісь хлопец з горам напалам атрымаў сярэднюю адукацыю й не прыдумаўшы, як адкасіць ад арміі, уладкаваўся пасьля службы ў прэзыдэнцкі канвой. На ўтрыманьне кожнага зь міліцыянтаў, пачынаючы ад малодшага сяржанта, дзяржава выдаткоўвае па 132 тысячы аднае толькі заработнае платы.

Усё ж добра, што штат міліцыянтаў скарачаецца. Толькі ня кожны з былых плямістых прыдатны для пракуратуры. Туды ідуць добра падрыхтаваныя кадры. Усе як адзін маюць БДУшныя дыплёмы. Альтэрнатыўным пропускам на працу можа стацца дакумэнцік, падпісаны ў Інстытуце правазнаўства ці Акадэміі кіраваньня.

Здаючы ўступныя іспыты, будучыя аналітыкі спадзяюцца прысьвяціць сябе разматваньню хітрых клубочкаў злачынскіх задумак. На практыцы ж яны сутыкаюцца з праявамі дэградацыі беларускага народу. Забойствы складаюць большую частку перадаваемых у пракуратуру спраў. Збольшага людзі гінуць у побытавых абставінах, калі стымулам для дзеяньняў злачынцаў зьяўляюцца грошы. Пракуратурным сьледчым вядомыя выпадкі, калі знакамітых і ўплывовых у сфэры бізнэсу людзей забівалі ўсяго за паўтысячы амэрыканскіх даляраў, як дырэктара «Электроннага міру». Але гэта не мяжа.

Неяк кампанія з васьмёх чалавек адправіла да продкаў хлопца, спадзеючыся завалодаць ягонай торбай з 400 *USD*. Можа, калектыўная адказнасьць мусіла зьменшыць наступныя пакуты сумленьня, але пазбавіць чалавека жыцьця за паўсотні грыноў.

Заказных, па інфармацыі сьледчых, сярод забойстваў няшмат. Такія апэрацыі выконваюцца вельмі акуратна й раскрыць іх амаль немагчыма. Не прынесла плёну шматмесячнае расьледваньне па факце падрыву нейкага бізнэсоўца ва ўласным аўтамабілі.

Пракуратурныя працаўнікі займаюцца таксама й справамі па зьнікненьнях людзей. Яны лічаць, што ўсе скандалы вакол здарэньняў з палітычнымі дзеячамі й вядомымі ў грамадзтве асобамі ня могуць мець прытэнзыяў на дзяржаўныя рэпрэсіі. Па прызнаньні аднога са сьледчых, улада валодае нашмат мацнейшымі сродкамі, чым тыя, якія яна часам дэманструе. Перасьлед, праслухоўваньне тэлефонаў і хапуны на мітынгах можна параўнаць хіба толькі зь лёгкай грозьбай пальчыкам. Пакараньняў рамянём апазыцыянэры яшчэ ня бачылі. Наўрад ці нехта зь іх ведае, да якога стану можа давесьці каманда гэбістых, што неадступна хадзілі за нейкім хабарнікам, адстаючы ад яго роўна на 15 мэтраў. Праз содні злачынца не вытрымаў і сам прыбег, гатовы падпісаць прызнаньне.

Дзяржава ж усяе свае моцы не паказвае, але й пільнасьці не губляе. Таму калі чарговы мітынг праходзіць быццам бы пры малой актыўнасьці міліцыянтаў, дык проста шмат хто зь іх пераапрануты ў цывільнае, а пераважная большасьць абаронцаў грамадзкага спакою цікуе за дэманстрантамі не 50-х, а з сотні мэтраў ад апазыцыйнага ядра. ■

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# Справа палітычная

СЯРГЕЙ ГВОЗДЗЕЎ

**У польскай турме ўтрымоўваецца былы беларускі бізнесовец, а з 1997 году — грамадзянін Ізраіля, Леанід Воўк.**

Былы кіраўнік кампаніі «МетІнком», якая займалася вытворчасцю высокадакладных інструментаў з металёвага парашку, быў затрыманы ў Варшаўскім аэрапорце Окенчэ 4 лютага па запыту беларускага бюро Інтэрпола. Ад добраахвотнай экстрадыцыі ў краіну, дзе бясследна знікаюць палітычныя апаненты рэжыму і бізнесоўцы, а іншыя сядзяць у турмах, у краіну, якую ён пакінуў *«з прычыны неспрыяльнай сітуацыі, шматлікіх рэвізорскіх праверак, а таксама з-за сістэматычных пагрозаў з боку вышэйшых асоб улады»*, Леанід Паўлавіч адмовіўся. Яго далейшы лёс мусіць вырашыць польская феміда.

На першы погляд, выпадак ардынарны, але вельмі цмяны ад самага пачатку, і таму выклікае шэраг пытанняў. Што ж інкрымінуецца быламу грамадзяніну РБ?

Незварот банкаўскага крэдыта, які сп. Воўк браў у «Знешэканомбанке» ў 1995 годзе, з'явіўся афіцыйнай падставай для затрымання. Але крэдыт рэгулярна сплочваўся да самага ад'езду бізнесоўца. Вядомыя выпадкі, калі ў Палату прадстаўнікоў у 2000 годзе балатаваліся асобы, якім мажліва было б пры жаданні ўлады інкрымінаваць тое ж самае, ці нешта падобнае.

Па затрыманні сп. Ваўка беларускія праваахоўчыя органы высунулі іншае абвінавачванне –*«утойванне, заніжэнне даходу і прыбытку»* з атрыманага крэдыта ў памеры 2 мільёны 300 тысяч *USD*. Потым беларускі бок досыць аператыўна прадаставіў абвінаваўчыя матэрыялы, у якіх ужо фігуруе сума крэдыта, што перавышае 3 мільёны *USD*. Ва ўсіх фінансава-прававых нюансах гэтай справы разбіраецца польскі суд. Дарэчы, 26 лютага адбылося першае слуханне, але з-за недастатковасці матэрыялаў, перададзеных беларускім бокам, наступнае паседжанне перанесена.

Нас жа цікавіць не столькі тэндэнцыя росту грашовых дамаганняў беларускай дзяржавы (гэта як раз зразумела ў святле канцэпцыі – *«па 100 даляраў кожнаму»*), колькі пазіцыя кантрольна-падатковых органаў Беларусі. Тры гады (з 1996 па 1999) беларускую дзяржаву гэтыя дробязі не хвалявалі. Увесь 2000 год бізнесоўца нібыта лавілі, а вось у 2001 годзе...

Беларускія праваахоўчыя органы распачалі паляванне на Леаніда Воўка яшчэ ў кастрычніку 1999 года. Акурат праз месяц пасля таямнічага знікнення палітыка Віктара Ганчара і прадпрымальніка, сябра Савета банка «Пошук», Анатоля Красоўскага. «Гончы ліст» быў выпісаны на імя былога старшыні савета таго ж банка – Леаніда Ваўка. Можа, для такой адметнай ва ўсіх сэнсах краіны, як цяперашняя Беларусь, нічога дзіўнага і не было б у тым, што дырэктар ізраільскай фірмы «Арді» сп. Воўк, па ўласным прызнанні, пра гэты ліст-росшук нічога не ведаў да моманту свайго затрымання. І сапраўды, чаго не бывае, ну не паінфармавалі.


Бянтэжыць іншае – пра абвешчаны росшук не ведалі прадстаўнікі праваахоўных органаў тых краінаў, якія наведваў бізнесовец падчас сваіх шматлікіх замежных ваяжоў, ужо пасля таго, як на яго былі расстаўлены сцяжкі. Міжвольна з'яўляецца ўраджанне, што гончы ліст – як стрэльба на сцяне, абавязкова мусіў стрэліць, але не адразу, а тады, калі гэта будзе неабходна.

Ёсць падставы меркаваць, што раптоўнае з'яўленне справы Ваўка напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі не выпадковасць.


Добра вядома, што адзін з заснавальнікаў і генеральны спонсар «Альтэрнатыўнага тэатра», кампаніі «Клас-клуб ДжазКрафт» Леанід Воўк апекваўся не толькі культурай. У сваім лісце на імя міністра юстыцыі Польшчы старшыня Браслаўскай раённай арганізацыі БНФ «Адраджэнне» Кастусь Шыдлоўскі адзначае, што: *«Вельмі істотную дапамогу ў ажыццяўленні некалькіх важных праектаў аказаў Леанід Воўк... Ім былі падтрыманы навукова-краязнаўчыя канферэнцыі «Браслаўскія чытанні» (1994-1997 гг.), удзельнікамі якіх былі даследчыкі з Беларусі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Расіі. На абсталяванні фірмы выпушчаны першы нумар гістрычнага зборніка «Браслаўскія сшыткі», выдання, якое не падлягае дзяржаўнай цэнзуры. Фірма неаднойчы аказвала дапамогу ў раздрукоўцы разнастайных матэрыялаў культурніцкага і палітычнага зместу»*.

Аб падтрымцы апазіцыйнага руху на Беларусі ад імя Аб'яднанай грамадзянскай партыі сведчыць Анатоль Лябедзька, заўважаючы, што *«Л. П. Воўк, будучы заўважнай асобай у беларускім бізнесе, займаў актыўную пазіцыю ў прадпрымальніцкім руху, дапамагаў апазіцыі і менавіта ён падвяргаўся найбольшаму і сур'ёзнаму пераследу»*.

Падчас выбарчай кампаніі 1994 года Леанід Воўк адкрыта фінансаваў кандыдата ад апазіцыі. Не выключана, што напярэдадні восеньскіх баталіяў 2001 года рэжым робіць літаральна ўсё, каб пазбегнуць любой мажлівасці прыватнай фінансавай падтрымкі кандыдата ад дэмакратычнага блока. У Польшчы справа Ваўка ўжо набыла моцны грамадскі розгалас – уважліва сочыць за ёй Польскі хельсінскі камітэт. Матэрыялы, прадастаўленыя беларускім бокам, запатрабаваў для вывучэння міністр юстыцыі Польшчы. Апеляцыйная скарга, пададзеная адвакатамі Антоніям Шымкучам і Марцінам Дзбаньскім, аб змяненні меры стрымання Леаніду Ваўку і вызваленні яго пад залог пры наяўнасці жытла і паручыцеля будзе разглядацца. ■



СПОРТОБЗОР



## МЫ ТОЖЕ БЕЖИМ!

9–11 марта в Лиссабоне прошел VIII зимний чемпионат мира по легкой атлетике. Значимых достижений на предыдущих состязаниях белорусские спортсмены пока не имели, но достаточно успешное выступление наших легкоатлетов на Олимпиаде в Сиднее вселяло определенные надежды. И они блестящим образом оправдались. Прежде всего, благодаря нашим женщинам. Олимпийская чемпионка в толкании ядра и наша главная надежда Янина Корольчик не набрала необходимую форму и заняла лишь девятое место (17,52 метра). Но ей нашлась достойная замена в лице Надежды Остапчук, которая сумела навязать острую борьбу российским спортсменкам и с результатом 19,24 метра занять второе место. Ее успех, но уже в беге на 200 метров, поддержала Наталья Сафронникова. Пробежав финальный забег за 23,17 сек., Наталья заняла третье место, принеся нашей стране первую в ее истории медаль в спринте (попутно ею же был установлен новый рекорд Беларуси – 23,02 сек.).

Но истинным героем соревнований стала наша многоборка – Наталья Сазанович. Ни в барьерном спринте, ни в прыжках в высоту и длину, ни в толкании ядра и беге на 800 метров наша спортсменка никому не дала повода усомниться в своей силе. В итоге – первое место и новый рекорд чемпионатов мира (4850 очков). Так же здорово, хотя и без медалей, выступили и их подруги по команде: Алеся Турова (6-е место на 1500 метров) и Наталья Сологуб (11-я на 400).

Увы, наши мужчины не сумели поддержать почин представительниц слабого пола. Ни Андрей Чубса (высота), ни Александр Главацкий (тройной прыжок) не сумели составить конкуренцию лидерам.

## О ЧЕСТНОЙ ИГРЕ ЗАМОЛВИТЕ СЛОВО

6 марта во встрече Лиги чемпионов «Реал» (Мадрид) – «Лидс» форвард мадридцев Рауль забил мяч рукой. Ничего необычного в этом не было бы, если бы не дальнейшие события. Дело в том, что арбитр встречи этот эпизод пропустил, и гол был засчитан. Но в перерыве испанец признался судье в своей ошибке (а ведь мог промолчать), и тому пришлось идти в раздевалку к англичанам с извинениями. В итоге этим делом занялся УЕФА. Решением европейских футбольных функционеров Рауль оштрафован на 11 тысяч долларов и дисквалифицирован на одну игру в Лиге чемпионов (которая, к счастью, уже ничего для «Реала» не решает). Это вызвало возмущение не только в испанских футбольных кругах.

Винить Рауля за игру рукой никак нельзя – чего в пылу борьбы не бывает – и не он виноват в том, что судья ничего не заметил. В конце концов, он же признался. И этим выгодно отличается от того же Марадонны с его «*божественной рукой*», который, по большому счету, гордится своим поступком. На наш взгляд, гораздо больше поводов гордиться собой у того же Рауля или, например, Робби Фаулера (пару лет назад, признав, что нарушения против него не было, он вынудил судью отменить пенальти).

## ДАЛЬШЕ — СОЛТ-ЛЕЙК СИТИ

В минувшие выходные очередным этапом Кубка мира завершился сезон у мастеров фристайла. Результаты этого года радуют сердца белорусских болельщиков и позволяют надеяться на будущие победы, и прежде всего в Солт-Лейк Сити. Но обо всем по порядку. В финском Химасе наши спортсмены в очередной раз подтвердили свой высокий статус. Без сбоев проведя оба прыжка в акробатике, Алла Цупер поднялась на третье место, его же она заняла и в общем зачете Кубка мира. В первенстве у мужчин вновь удачно выступил Алексей Гришин, занявший первое место. Немного отстал от него Дмитрий Дащинский (6-й результат). Надеемся, что к Олимпийским играм 2002 года ребята не только не растеряют форму, но и еще и прибавят в мастерстве. Ведь должен же быть хоть один вид спорта, в котором мы можем быть уверены в том, что победим.

## НИ ДНЯ БЕЗ РЕКОРДА!

На прошедшей неделе сильнейшие конькобежцы мира опробовали каток в Солт-Лейк Сити, на котором через год состоятся очередные Олимпийские игры. И он не разочаровал их. Было установлено пять мировых рекордов. Их авторами стали: Катриона Лемэй-Доун (500 метров), Хироями Шиницу (500), Моника Гарбрехт (1000), легендарная Гунда Ниман (5000) и Уотерспун (1000). Так что на Олимпиаде можно ожидать нешуточную борьбу, а значит, и высоких результатов от конькобежцев.

## РОССИЯНЕ ПРИСТУПИЛИ

Тем временем, как чемпионаты ведущих футбольных держав Европы приближаются к своему завершению, российский чемпионат только стартовал. В этом сезоне в российских клубах будет выступать как никогда малое количество легионеров из Беларуси – всего двадцать человек. Наибольшее количество наших футболистов будет наблюдаться в московском «Локомотиве» и воронежском «Факеле». Хотя вряд ли многие из них смогут в этом сезоне появиться в основных составах своих клубов. Многие специалисты считают, что именно в этом сезоне развернется наиболее напряженная борьба за чемпионский титул, так как возможности команд значительно выровнялись. В качестве основных конкурентов московского «Спартака» прежде всего называют московские же «Локомотив», ЦСКА, «Торпедо», хотя могут выстрелить многие. После первого тура лидерство захватил традиционно сильно выступающий по весне новороссийский «Черноморец» под руководством Анатолия Байдачного.

Подготовил СЕРГЕЙ ВИТАЛЬЕВ

ЦІКАВА

# ХВАРЭЦЬ НА ТАТУМАНІЮ

ГАЛІНА ЖЫГУЛЬ

**Летам на пляжы бачыла парачку:** у яго на спіне – мудрагелісты сюжэт з нейкімі монстрамі, завушніцы, нос праколаты. А ў дзяўчыны – дракон на спіне, змеі на руках і пупок нейкай металічнай штуковінай паблісквае.

З першага позірку бачна, што распісваў маладое цела не нейкі самавук, а вопытны майстар. Парачка, хаця і дзікавата выглядала, але паводзіла сябе даволі прыстойна – маладыя людзі чыталі кніжкі, плавалі, загаралі, слухалі музыку.

– Не балюча было такое з сабой выраблядь? – асцярожна пацікавілася ў суседзяў.

– Прыгажосць патрабуе ахвяраў,– коратка адказаў хлопец.

– Непрыемна, напэўна, калі язык праколваеш, альбо яшчэ што-небудзь далікатнае, – заўважыла яго прасунутая па поўнай праграме сяброўка.

Ад гэткага каментарыя ў мяне халадок прабег па спіне, калі ўявіла, як праколваюцца, няхай і з анастэзіяй, самыя далікатныя часткі цела.

Пры савецкай уладзе татуіроўкамі захапляліся хіба што крымінальныя элементы. На зоне і ў турме для кожнай катэгорыі правапарушальнікаў быў свой знак, які вызначаў, да таго ж, і іх статус у месцы зняволення. »Не забуду маці родную», «Каханне – да труны» і яшчэ шмат чаго пісалі на сваіх торсах і законапаслухмяныя грамадзяне.

Рабілася, прынамсі, усё гэта даволі прымітыўнымі спосабамі: ці простай іголкай, ці з дапамогай электрычнай брытвы. Пазбавіцца ж гэтых знакаў людзі ўжо не маглі і мусілі цягаць усё гэта на сваім целе, калі за справу не браўся хірург. А ў выніку на целе заставаліся шрамы і рубцы.

На Захадзе ў *tattoo* ўжо ў пачатку 70-х гадоў з'явілася шмат прыхільнікаў. У Еўропе, напрыклад, такіх салончыкаў, дзе можна было што-небудзь пракалоць на сваім целе альбо распісаць, з'явілася мноства. Татуіроўку там зробяць якасна і па любым шаблоне. Тэхналогія распрацаваная. Але абыдзецца гэта працэдура, у залежнасці, канешне, ад памераў, у даволі значную суму. Роспіс усёй спіны можа каштаваць пад тысячу даляраў.


Дарэчы, першы такі салон пад назвай «У Лісіцы» ў Мінску адкрыўся чатыры гады таму. І ўжо абслужыў каля пяці тысяч кліентаў. Бізнес гэты запатрабаваны і шырока рэкламуецца. Як кажа гаспадыня салона, яго заснавальніца Святлана Жыгімонт, спачатку палову кліентаў складалі людзі, якія хацелі пазбавіцца сваіх прымітыўных самаробных наколак. Хапае іх і цяпер. Аднак асноўная публіка – дастаткова заможныя маладыя людзі 20–30 гадоў.

Бывае, што прыходзяць зусім юныя дзяўчаткі ці хлопцы. І тады ў салоне патрабуюць прад'явіць пашпарт, каб пасля не мець непрыемнасцяў з бацькамі, якія, як правіла, не ўхваляюць членашкодніцкія схільнасці сваіх нашчадкаў.

Да таго ж, падлеткі нярэдка жадаюць упрыгожыць сябе сімволікай, значэння якой не разумеюць. Скажам, павук у павуціне ці карона з масцю бубны – гэта знакі гомасексуалістаў і злодзеяў, ёсць яшчэ так званыя сатанінскія знакі, якімі пазначаюць сябе члены розных сектаў... Даводзіцца праводзіць растлумачальную работу.

Святлана Жыгімонт – прафесійны мастак. Яна лічыць, што займацца татуіроўкамі павінны людзі са спецыяльнай адукацыяй, каб нанесены малюнак меў пэўныя эстэтычныя якасці. Салон «У Лісіцы» гарантуе якасць выканання і адпаведныя дзяржаўныя стандарты.

Матэрыял, з якім даводзіцца працаваць Святлане Жыгімонт і яе калегам, даволі своеасаблівы. Гэта чалавечая скура. Ёсць, як кажа майстар, людзі з тоўстай скурай, а ёсць – з тонкай. Гэта ў тым сэнсе, што ў кожнага свой балявы парог. Адзін, бывае, у час працэдуры толькі зморшчыцца, а іншы можа і прытомнасць страціць.



Натуральна, што за чатыры гады працы ў салоне, а да гэтага Святлана некалькі гадоў практыкавала на сваіх сябрах, у яе назапасіўся вопыт. З любой складанай работай яна спраўляецца за 2–3 гадзіны.

– *У апошні час да нас прыходзіць шмат маладых жанчын,* – кажа Святлана, – *пасля гінекалагічных аперацый, і я стараюся зрабіць што-небудзь далікатнае, каб не было бачна грубых рубцоў і дзяўчаты маглі загараць летам у прыгожых купальніках. Але ў асноўным публіка малапатрабавальная і без асаблівых фантазій – заказваюць што-небудзь просценькае і даволі банальнае – матылькоў, кошачак, кветачкі. Для мяне гэта не вельмі цікава. Вось нестандартныя праекты – гэта захапляюча! Напрыклад, малады чалавек захацеў зрабіць на сваіх грудзях партрэт любімай жонкі, альбо заказана спіна з тату-копіяй вядомага твора мастацтва... Альбо на зусім лысай галаве зрабіць імітацыю галеных валасоў.*

У Святланы Жыгімонт часта пытаюцца, ці можна зрабіць часовую татуіроўку. Ёй даводзіцца расчароўваць сваіх кліентаў. У якасці часовага ўпрыгожання яны могуць выканаць бодзі-арт спецыяльнымі фарбамі, якія трымаюцца каля тыдня. Калі гэта хна, то можа і болей месяца. Такую часовую наколку яна зрабіла сваёй маленькай дачцэ, ад чаго ye равеснікі ў дзіцячым садку рыдалі ад зайздрасці.

– *Цікава, што, прыйшоўшы аднойчы ў салон, наведвальнік нярэдка становіцца пастаянным яго кліентам, пачынае хварэць на татуманію. Адзін малюнак надакучвае, робіцца іншы, потым наступны, пакуль не застаецца ніводнага чыстага ад малюнкаў кавалачка цела. Але гэта яшчэ не ўсё. Татуіруюць павекі, губы (так робіцца перманентны макіяж), праколваюцца дзіркі ў самых розных частках цела – у вуху, брыве, носе, языку, пупе ці геніталіях. Калі пры татуіроўцы рана зажывае за пару дзён, то праколаты пупок выклікае праблемы аж з паўгода. Ну, дзіркі ў далейшым, скажам, зарастуць. А вось як будуць выглядаць тысячы нашых суайчыннікаў з усімі гэтымі монстрамі, гоблінамі, змеямі, скарпіёнамі, флорай і фаунай, калі пасталеюць самі, стануць бацькамі, а потым дзядулямі і бабулямі?*

Хочаш – не хочаш, а задумаешся аб прыродзе чалавека і шляхах развіцця сучаснай цывілізацыі. Людзі старэйшага веку глядзяць на татуіраваных падлеткаў і моладзь з асуджэннем і ставяцца да адроджанага мастацтва на целе, спісваюць гэта на існуючую цяпер уседазволенасць і магутны наступ масавай культуры з Захаду. Можа, чалавецтва падсвядома рыхтуецца да глабальнага паціплення на зямлі, да нейкіх прыродных катаклізмаў, якія зробяць жыццё сучаснага чалавека падобным да жыцця першабытных продкаў?

■

ТЕАТР

# Кто кого укротил?

ТАТЬЯНА ПОЛЯКОВА

**В Молодежном театре — премьера, постановка Сергея Ковальчика по пьесе Джона Флетчера «Награда женщине или укрощение укротителя». Увидев название, я подумала, что речь о современной полемике с Шекспиром. Но оказалось, пародию на великого драматурга написал его современник Джон Флетчер.**

Во времена правления королевы Елизаветы в Лондоне было два театра. С шекспировским «Глобусом» конкурировали артисты, руководимые Френсисом Бомонтом и Джоном Флетчером. Через две недели после шумной премьеры у Вильяма лондонская публика переезжала на другую сторону Темзы, чтобы посмотреть пародию на очередной шедевр.

Главная героиня, строптивая Катарина, названа в пьесе Флетчера Марией, а проще Мэри. Ее сестра Бьянка стала замужней кузиной, хитрой бестией и запраской интриганткой. Зато появилась родная сестра Оливия, очень милая, но легкомысленная девчонка, запутавшаяся между двумя кавалерами — почтенным и щедрым старцем и юным воздыхателем. Мальчишка, конечно, приятнее, но старичок все время дарит платья, драгоценности, перчатки, чулки, подвязки и прочие нужные в хозяйстве вещи. Впрочем, стараниями хитрой Бьянки конфликт разрешается счастливо. Девицу выдают за влюбленного в нее молодого парня.

Гораздо на выдумки Мэри в финале спектакля удается выдрессировать Петручио. Но поскольку пьесу написал мужчина, рожденный 400 лет назад, а не какая-нибудь нынешняя феминистка, боевитая супруга сражается вовсе не за то, чтобы водрузить на согбенную шею муженька свой отточенный каблук. Она хочет любить законного супруга, можно сказать, уже любит, но перед тем, как упасть в брачную постель, жаждет обтесать и воспитать мужлана, чтобы супружеская любовь была для женщины не в тягость, а в охотку. В финале актеры призывают Мэри и Петручио любить и уважать друг друга. Как говорится, победила дружба. Такая вот развлекательно-назидательная пьеса.

Мужчины в этом спектакле простоваты, воинственны и благородны, способны прощать возлюбленным их интриги, нападки и не всегда безобидные шутки. Дамы несравненно хитрее и тоньше, что помогает им отстаивать свои права и интересы, что в начале XVII века было вовсе не просто. Ибо царствовал жесткий патриархат. Чуть что, мой меч – твоя голова с плеч. Кстати, мать Елизаветы – королева Анна Болейн (вторая по счету супруга Генриха VIII) – и его седьмая женушка окончили свои жизни на плахе по подозрению в супружеской измене. Бедняжка Елизавета долго ждала, пока ее голову украсит корона. Век бы ей не быть ей королевой, этой рыжей девчонке сомнительного происхождения, если бы один за другим не умирали остальные королевские отпрыски.

